# Юбилеи

# Юбілеі

# Jubilee

## Петр Алексеевич ШУПЛЯК

## Пётр Аляксеевіч ШУПЛЯК

## Petr Alyakseevich SHUPLJAK



Першаму дэкану гістарычнага факультэта БДУ ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь, аднаму з вядучых айчынных германістаў, доктару філасофіі (гісторыя, універсітэт імя Ф. Шылера, г. Ена), прафесару Пятру Аляксеевічу Шупляку 8 верасня 2018 г. спаўняецца 75 гадоў.

Пётр Аляксеевіч нарадзіўся ў сялянскай сям'і Аляксея Ігнатавіча і Соф'і Пятроўны Шуплякоў у вёсцы Брускаўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. Першыя гады жыцця будучага навукоўца прайшлі ва ўмовах нацысцкай акупацыі і пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі. Таму цяжар народнага жыцця, складанасць лёсу беларускага народу знаёмы нашаму юбіляру не з кніг. Няпростае дзяцінства і бацькоўскае выхаванне прывілі Пятру Аляксеевічу павагу да працы, арыентацыю на сумленнасць, адказнасць і высокую самадысцыпліну. Гэтыя якасці і сталі яго неад'емнымі рысамі з малых гадоў. Пётр Аляксеевіч старанна дапамагаў бацькам па гаспадарцы і не менш старанна і рупліва вучыўся ў школе, якую і скончыў у 1961 г. з сярэбраным медалём.

Як успамінае сам навуковец, гісторыю ён любіў з дзяцінства: чытаў кніжкі, падручнікі, слухаў радыёперадачы, навіны – асабліва тыя, што паведамлялі аб палітычным, сацыяльным, эканамічным жыцці замежных краін. Таму ў нейкім сэнсе выбар прафесіі гісторыка, магчыма, быў наканаваны. Ва ўсялякім выпадку ён лагічна ўпісваўся ў інтарэсы Пятра Аляксеевіча. Як вядома, гісторыя не ведае ўмоўнага ладу. Аднак айчынная гістарычная навука магла і не атрымаць аднаго з сваіх выбітных прадстаўнікоў: школьны настаўнік гісторыі адгаворваў вучня – Пятра Шупляка – ад вы-

бару прафесіі гісторыка. Нават бацькі не адразу далі сваё блаславенне на выбар гэтага шляху. Яны марылі, каб сын стаў афіцэрам. Несумненна, Пётр Аляксеевіч праявіў бы сябе і ў афіцэрскім корпусе. Аб гэтым сведчыць тое, што тэрміновую службу (1962–1965 гг.) ён скончыў у званні старшыні – найвышэйшым для салдата. Таму можна меркаваць, што, выбраўшы ўсё ж вайсковую службу ў якасці асноўнай прафесіі, Пётр Аляксеевіч мог прымаць віншаванні ў якасці палкоўніка або нават генерала.

Аднак, як прызнаецца сам навуковец, паступіць на гістфак было яго марай і імкненнем. І ён здзейсніў гэту мару: у 1965 г. стаў студэнтам гістарычнага факультэта БДУ. Вучоба яму падабалася, ён чытаў многа кніг і артыкулаў, рабіў канспекты. Быў дысцыплінаваным і працавітым студэнтам. Займаўся даследчыцкай працай, удзельнічаў у канферэнцыях, вёў грамадскую дзейнасць. Як любому чалавеку, які сумленна працуе, вучоба Пятру Аляксеевічу давалася лёгка, і ў 1970 г. ён з адзнакай скончыў універсітэт. Па заканчэнні вучобы быў размеркаваны выкладчыкам на родную кафедру (гісторыі новага і навейшага часу), з якой будзе звязана ўсё далейшае яго прафесійнае жыццё.

Досыць рана вызначылася галіна навуковых інтарэсаў юбіляра: навейшая гісторыя Германіі – складаная, супярэчлівая, якая ставіць перад даследчыкам няпростыя пытанні, але тым больш цікавая.

Варта адзначыць, што германістыка – гэта класічная спецыялізацыя кафедры гісторыі новага і навейшага часу. Шэраг прац па гісторыі Германіі ў новы час яшчэ ў першай палове XX ст. апублікаваў адзін з пачынальнікаў вывучэння ўсеагульнай гісторыі ў БССР В. М. Перцаў. Адным з карыфеяў савецкай германістыкі быў першы загадчык кафедры – Л. М. Шнеерсон, які з'яўляўся навуковым кіраўніком Пятра Аляксеевіча пры напісанні курсавых і дыпломнай прац. Менавіта ён і ўбачыў у маладым студэнце Пятры Шупляку будучага прафесійнага гісторыка, свайго калегу. Варта адзначыць, што значная частка старэйшага пакалення супрацоўнікаў кафедры была прыведзена ў навуку менавіта Л. М. Шнеерсонам: П. А. Шупляк, У. С. Кошалеў, В. М. Пісараў, В. І. Сініца і інш.

На станаўленне Шупляка-гісторыка, акрамя Л. М. Шнеерсона, паўплывалі выкладчыкі гістарычнага факультэта М. П. Палетыка, Г. М. Ліўшыц, а таксама доктар М. Вайсбеккер, які стаў навуковым кіраўніком кандыдацкай дысертацыі Пятра Аляксеевіча падчас вучобы ў аспірантуры ў ГДР.

Такім чынам, у 1970/1971 навучальным годзе пачалася працоўная дзейнасць Пятра Аляксеевіча ў якасці выкладчыка на гістарычным факультэце. У 1973 г. ён быў накіраваны на вучобу ў аспірантуру ва ўніверсітэт імя Я. Ф. Шылера ў г. Ена (ГДР). Тут пад кіраўніцтвам буйнога нямецкага гісторыка М. Вайсбеккера датэрмінова падрыхтаваў і абараніў дысертацыю «Прафсаюзы і стачачная барацьба ў Германіі ў перыяд эканамічнага крызісу 1929–1933 гг.» (1975 г.). Па выніку абароны яму была прысуджана вучоная ступень доктара філасофіі.

Навукова-даследчую дзейнасць у Ене Пётр Аляксеевіч сумяшчаў з грамадскай, педагагічнай, арганізатарскай. У прыватнасці, кіраваў тут гуртком палітасветы савецкіх студэнтаў і аспірантаў «З гісторыі германскага рабочага руху і інтэрнацыянальнае супрацоўніцтва працоўных Германіі і СССР», а потым, ужо пасля вяртання ў Мінск, разам з калегамі па кафедры – К. А. Даўгучыц, В. А. Радзьковай і В. М. Пісаравым – кіраваў групай студэнтаў-практыкантаў з гістарычнага факультэта БДУ ў Енскім універсітэце. У 1977 г. адбылося адкрыццё пакоя дружбы СССР – ГДР, афармленага П. А. Шупляком і У. М. Пісаравым.

У 1970–1980-х гадах дацэнт П. А. Шупляк вядзе актыўную выкладчыцкую працу, а таксама піша вучэбна-метадычныя і навуковыя працы. Ён выступае на шматлікіх канферэнцыях у СССР і ГДР, праходзіць стажыроўкі ў Енскім універсітэце (1984 г.), у МДУ імя М. В. Ламаносава (1988 г.).

Арганізатарскія здольнасці навукоўца рэалізаваліся, калі ў 1981 г. ён заняў пасаду намесніка дэкана па вучэбнай рабоце, а ў 1991 г. – дэкана гістарычнага факультэта. У 1993 г. яму было прысвоена вучонае званне прафесара.

Падчас працы Пятра Аляксеевіча дэканам (1991–1996 гг.) фактычна былі закладзены асновы таго факультэта, якім сёння з'яўляецца гістфак БДУ. Адным з першых рашэнняў было стварэнне беларускамоўнага патоку для навучання. Прычым і ў гэтым пытанні выявіўся такт Пятра Аляксеевіча і яго ўменне спалучаць ідэальныя памкненні з рэальнасцю: можна было валявым рашэннем загадаць неадкладна перавесці ўвесь працэс навучання на адзіную ў той час дзяржаўную мову – беларускую. Аднак новы дэкан, які не на словах, а на справе быў дэмакратычным чалавекам, вырашыў правесці кансультацыі з супрацоўнікамі факультэта, паразважаць, наколькі рэалістычна адразу зрабіць факультэт беларускамоўным па загадзе і наколькі якаснымі будуць тады выкладанне і атрыманая адукацыя. У выніку быў абраны кампрамісны шлях, які аказаўся стратэгічна правільным: па прапанове дэкана аддзяленне філасофіі і палітэканоміі было выведзена за межы факультэта (пасля на базе гэтага аддзялення быў створаны філасофска-эканамічны факультэт), а аддзяленне гісторыі КПСС было закрыта зусім. Вызваленыя рэсурсы накіравалі на стварэнне першага ў краіне беларускамоўнага аддзялення на гістарычным факультэце.

Разам з гэтым новы дэкан ініцыяваў і іншыя пачынанні і змены: былі адкрыты новыя спецыяльнасці (архівазнаўства і музеязнаўства), што дапамагло забяспечыць рэспубліку ўласнымі спе-

цыялістамі; было адкрыта аддзяленне міжнародных адносін, якое пазней стала самастойным факультэтам; з'явіліся новыя кафедры. Гістарычная адукацыя і ўніверсітэцкая навука атрымалі магутны стымул для развіцця і свабоднай творчасці.

Як патрыёт і прыхільнік гісторыі, Пётр Аляксеевіч актыўна ўключыўся ў метадалагічныя, арганізацыйныя дыскусіі, якія былі вельмі актуальнымі ў новай маладой дзяржаве, шукаў уласныя адказы на пытанні «хто мы» і «куды мы ідзем». Ён апынуўся сярод тых гісторыкаў, якія разумелі: без выхаду гістарычнай навукі з кабінетаў і аўдыторый, без папулярызацыі навукі і ведаў немагчыма пабудаваць новае грамадства. Таму Пётр Аляксеевіч быў сярод ініцыятараў стварэння і членаў рэдакцый новых гістарычных часопісаў («Беларускі гістарычны часопіс» і «Беларуская мінуўшчына»).

Навуковец спрыяў развіццю супрацоўніцтва паміж універсітэцкай і акадэмічнай навукай. Так, 3–5 лютага 1993 г. была праведзена І Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы)». На ёй прафесар Шупляк выступіў з канцэптуальным дакладам «Праблемы гістарычнай адукацыі ў ВНУ Рэспублікі Беларусь». У тым жа месяцы, дзякуючы намаганням Пятра Аляксеевіча, было створана прафесійнае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя гісторыкаў» (БАГ), у якое ўвайшлі вядучыя гісторыкі беларускіх ВНУ і Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Дэкан гістфака быў абраны старшынёй БАГ, яго намеснікам стаў дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, прафесар М. П. Касцюк.

З другой паловы 1990-х гг. прафесар П. А. Шупляк накіроўвае свае асноўныя сілы на падрыхтоўку студэнтаў, аспірантаў, правядзенне навуковых даследаванняў. Ён працуе з рознымі тэмамі навукова-даследчых прац, накіраванымі на больш глыбокае разуменне асноўных тэндэнцый сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця Германіі і краін Еўропы, рыхтуе новыя лекцыйныя і спецыяльныя курсы, піша вучэбна-метадычныя дапаможнікі, навуковыя артыкулы, падручнікі. Свайго роду жамчужынай у вучэбна-педагагічнай дзейнасці Пятра Аляксеевіча з'яўляецца двухтомнае выданне «Гісторыя навейшага часу», падрыхтаванае пад яго кіраўніцтвам групай выкладчыкаў кафедры гісторыі новага і навейшага часу. Гэта першы ў рэспубліцы ўніверсітэцкі падручнік па навейшай гісторыі заходніх краін, выдадзены на беларускай мове.

Прафесар Шупляк рыхтуе не толькі студэнтаў, але і кадры вышэйшай кваліфікацыі. У прыватнасці, на гістарычным факультэце працуюць і карыстаюцца заслужанай павагай студэнтаў дацэнты Я. Р. Колб і І. І. Шумскі, якія абаранілі кандыдацкія дысертацыі пад яго кіраўніцтвам (1995 г. і 2000 г. адпаведна).

Нельга не згадаць і яшчэ адну паспяховую сферу дзейнасці юбіляра – сям'ю. Ён шмат гадоў любячы муж, бацька і дзядуля. Магчыма, памятаючы, як няпроста было пачынаць уласны жыццёвы шлях, ён не стаў кіраваць сынамі адносна выбару іх будучай прафесіі, справядліва вырашыўшы, што найбольш правільным будзе падтрымаць іх у тых сферах, куды іх пацягнуць уласныя інтарэсы. Старэйшы сын – Андрэй – у 1995 г. скончыў гістфак (аддзяленне міжнародных адносін), шмат гадоў працуе ў Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь на розных пасадах. Малодшы сын – Сяргей – таксама скончыў гістфак БДУ (2001 г.), абараніў кандыдацкую дысертацыю і працуе намеснікам дэкана па навуковай рабоце на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя. М. Танка.

За сваю дзейнасць Пётр Аляксеевіч неаднаразова быў адзначаны рознымі ўзнагародамі: ганаровымі граматамі БДУ, Міністэрства адукацыі, ганаровым знакам у срэбры «За выбітныя поспехі і заслугі ў справе развіцця і ўмацавання германа-савецкай дружбы» (1989 г.), нагруднымі знакамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За выдатныя поспехі ў працы» (1987 г.) і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі» (2003 г.). Яго імя ўключана ў «Міжнародны біяграфічны слоўнік» (Кембрыдж, Англія).

Усе мы – яго сябры, калегі, вучні – жадаем Пятру Аляксеевічу, каб яго цела было такім жа здаровым і моцным, як яго дух і розум! Каб ён і далей дзяліўся з намі сваімі ведамі, мудрасцю, прафесійным майстэрствам, пачуццём гумару. Жадаем здароўя яго сям'і. Мы ўдзячныя лёсу за радасць зносін з юбілярам і спадзяемся на тое, што ўсіх нас чакаюць яшчэ доўгія гады гэтых зносін.

***Д. Г. Ларыёнаў***[1]

[1]*Денис Геннадьевич Ларионов* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории нового и новейшего времени, исторический факультет Белорусского государственного университета.

*Дзяніс Генадзьевіч Ларыёнаў* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі новага і навейшага часу, гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Denis G. Larionov*, PhD (history), docent; associate professor at the department of modern and contemporary history, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *dglarionov@yandex.ru*